**ХРАМ ПАД ПТУШЫНЫМІ КРЫЛАМІ**

Мілюк К. І.
Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, Беларусь
Кафедра сацыяльна-гуманітарных навук
Навуковы кіраўнік – дацэнт Стасевіч М. П.

Актуальнасць вывучэння гісторыі помнікаў архітэктуры тлумачыцца перш за ўсё тым, што гэта своеасаблівая дань нашым продкам, стварыўшым і на працягу многіх стагоддзяў захаваўшым гэтыя дзівосныя збудаванні, якія па сённяшні дзень упрыгожваюць многія гарады і вёскі нашай роднай Беларусі. Адным з такіх помнікаў з'яўляецца касцёл у Вялікай Бераставіцы.

Мэта і задачы даследавання: Асвятленне вынікаў вывучэння літаратурных крыніц па гісторыі старажытнага касцёла, вылучыць асноўныя яе этапы, акрэсліць важнейшыя праблемы і перспектывы адраджэння і далейшага існавання храма.

Касцёл у Вялікай Бераставіцы быў пабудаваны ў 1615 годзе па фундацыі Гераніма Хадкевіча, прадстаўніка вядомага роду Вялікага княства Літоўскага , якому ў той час належыла мястэчка і навакольныя землі.Архітэктура касцёла звязана з імем знакамітага каралеўскага і вялікакняжацкага архітэктара Джавані Трэвана. Прататыпам Вялікабераставіцкага касцёла, атрымаўшага назву "Прасвятой Дзевы Марыі" стаў касцёл Пятра і Паўла ў Кракаве, пабудаваны тым жа архітэктарам.

У XVII стагоддзі Вялікая Бераставіца з наваколлямі адышла роду Мнішкаў, у XVIII – роду Патоцкіх. Новыя гаспадары бераставіцкай зямлі клапаціліся аб лёсе храма, пастаянна даравалі на карысць яго дадатковыя прыбыткі. У ІІ-й палове XVIII стагоддзя касцёл стаў цэнтрам не толькі рэлігійнага, але і культурна-асветніцкага жыцця. Тут быў адкрыты прытулак для ўбогіх, трохі пазней – парафіяльная школа. У 1828 годзе ў школе вучылася 16 вучняў [1, с.558].

Час росквіту касцёльнага жыцця быў нядоўгім. Пасля паўстання 1863-64 гг. царскія ўлады пачалі рашучы наступ на касцёлы, якія падтрымлівалі паўстанцаў. Сярод іх быў і Вялікабераставіцкі храм.

У 1920 годзе ў будынку зноў быў адноўлены рымска-каталіцкі касцёл, у якім праводзілася служба па вялікіх святах. У гады абвастрэння "барацьбы з рэлігіяй", у пачатку 1960-х гадоў, ён быў закрыты поўнасцю. З таго часу і пачалося разбурэнне будынка.

У 1980-х гадах было прынята рашэнне аб рэстаўрацыі будынка. А потым пачалася "гарбачоўская перабудова", а ў жнівеньскі дзень у 1992 годзе палыхнулі агнём рыштаванні і гонтавы дах будынка... Пажар было відаць за дзясяткі кіламетраў навокал.

Самую высокую каланаду касцёла аблюбавалі буслы, зрабіўшы там сабе жытло. І кожную вясну яны вяртаюцца ў сваю буслянку… І доўга-доўга кружаць над храмам, сваімі белымі крыламі прыцягваючы позіркі жыхароў і гасцей пасёлка. А потым, трывожна-радасным клёкатам вітаюць людзей. А можа наадварот: не вітаюць, а папракаюць за іх нялюдскасць, бездухоўнасць, абыякавасць… А можа гэта душы нашых прашчураў, перасяліўшыся ў гэтых высакародных птахаў з вышыні той самай буслянкі просяць і чакаюць ад нас выправіць, аднавіць тое, што яны будавалі, а мы так бяздушна знявечылі?

Два гады таму новае кіраўніцтва раёна вырашыла прылажыць усе намаганні, каб аднавіць будынак. Шукаюцца грошы ў бюджэце, адклікнуліся жыхары раёна, не ўзіраючы на ўзрост і на веравызнанне. Будзем спадзявацца, што прыйдзе той час, калі храм будзе адноўлены і прыцягне сюды тысячы турыстаў з усёй Заходняй Еўропы.

**Літаратура:**

1. Памяць. Бераставіцкі раён. Мінск: БЕЛТА, 1999.
2. Беларуская энцыклапедыя. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1996.
3. Кулагін, А. Каталіцкія храмы на Беларусі / А. Кулагін, – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2000.

Рэпазіторый ГрДМУ